РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 студзеня 2025 г. ЧАЦВЕР № 20 (30408)

СПАЖЫВЕЦ

# СВАЁ АЎТА

## Дзякуючы рашэнню Прэзідэнта машыны беларускай вытворчасці застаюцца даступнымі




Кіраўніком дзяржавы прынята рашэнне аб падаўжэнні праграмы крэдытавання грамадзян Беларусі на набыццё айчынных легкавых аўтамабіляў BELGEE. Указ падпісаны 28 студзеня.

Гэта рашэнне дасць магчымасць людзям з сярэднім дастаткам — найбольш шматлікай і працаздольнай частцы насельніцтва краіны — ездзіць на новых машынах.

Так, на ўнутраным рынку за час існавання праграмы крэдытавання ёй скарысталіся больш як 33 тысячы фізічных асоб. Усяго ў Беларусі было прададзена больш за 70 тысяч аўтамабіляў вытворчасці СЗАТ «БЕЛДЖЫ».

СТАР. 6–7







ЗАМЕЖНЫЯ ЖУРНАЛІСТЫ НАВЕДАЛІ ГРАНІЦУ 8



ЧЫМ ЖЫВУЦЬ МАЛАДЫЯ АГРАРЫІ 12



НАША БАГАЦЦЕ

# КРАЙ ПЕРШАБЫТНАГА ЛЕСУ

Гісторыя найстарэйшай айчыннай асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі цесна звязана з экспедыцыяй заолага, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Анатоля Фядзюшына ў вярхоўі Бярэзіны. Там, сярод загадкавых балот, магутных бароў і карункавага сеціва лясных рэчак і ручаёў, навукоўцы знайшлі амаль знішчаны ў нашай краіне від — баброў.

Каб захаваць экасістэму гэтага «страчанага свету» і аднавіць папуляцыю самага буйнога грызуна Еўразіі, роўна 100 гадоў таму, 30 студзеня 1925-га, быў створаны Бярэзінскі біясферны запаведнік. Аб найбольш значных кірунках яго дзейнасці расказаў дырэктар запаведніка Андрэй ПРАКОШЫН.



СТАР. 9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

TikTok

ISSN 1990 — 763X

25020

9 771990 763008

АКЦЭНТЫ

# МОЦ, ШТО НАС ЯДНАЕ

**І хоць мінулыя прэзідэнцкія выбары — факт, які адбыўся, іх вынікі і безумоўная перамога дзеючага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з падтрымкай 86,82 % выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, — яшчэ доўга будзе бударажыць нашых заходніх апанентаў. Жартачкі вам: пасля ўзрушэнняў 2020-га беларусы зрабілі высновы і спакойна і ўзважана абралі свой шлях развіцця. Пра акцэнты цяперашняй электаральнай кампаніі пагаварылі з экспертамі.**

## ЛІДАР, ЯКОГА ПАДТРЫМЛІВАЕ НАЦЫЯ



У Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі існуе паняцце «электаральны суверэнітэт». Яму аддавалася асаблівая ўвага падчас выбараў Прэзідэнта. Ці ўдалося яго абараніць і адстаяць, у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» патлумачыў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег ГАЙДУКЕВІЧ.**

Госць студыі адзначыў, што мінулыя выбары пацвердзілі: Аляксандр Лукашэнка не проста Прэзідэнт, а нацыянальны лідар:

— Таму вынікі выбараў — гэта вынік яго падтрымкі. І толькі нацыянальны лідар можа ўтрымаць краіну ў такі час. Нам гэта трэба. Напрыклад, кіраўнік Літвы — гэта проста прэзідэнт. Таму што ён не аб'ядноўвае людзей. А Лукашэнка — нацыянальны лідар. Калі б было па-іншаму, то не ўтрымалі б краіну ні ў 2020 годзе, ні цяпер падчас усіх падзей.

Ва ўсе выбарчыя кампаніі, якія праходзілі ў нашай краіне з 1994 года, заўсёды ўмешваўся Захад, падкрэсліў эксперт:

— У іх заўсёды была мэта не зрабіць нашу краіну пасля выбараў мацнейшай, больш дэмакратычнай, а зрабіць так, каб яна аслабла, каб яе трэсла некалькі месяцаў. А гэтыя выбары ў Беларусі адрозніваліся тым, што мы прыбралі знешні фактар, не дапусцілі да выбараў «пятую калону». І, паглядзіце, яе няма, а канкурэнцыя ёсць, розныя кандыдаты, партыі і погляды. Калі ніхто з кандыдатаў не кажа: «Бяры камень, палку, ідзі на вуліцу, нават калі прайграў, і змагайся за ўладу, то для Захаду гэта недэмакратычна». Для іх дэмакратыя — гэта ўдзел у выбарах прадстаўніка «пятай калоны», які будзе адстойваць інтарэсы не Беларусі, а Захаду. Абавязкова, каб ён яшчэ да выбараў сказаў: «Я паклічу ўсіх на вуліцу — і там будзем вырашаць лёс выбараў, а таксама што выбары недэмакратычныя».

На цяперашніх выбарах была вялікая колькасць еўрапейскіх назіральнікаў, але ні адзін з іх не сказаў пра недахопы, заявіў госць студыі:

**— Я размаўляў з англійскімі і нямецкімі журналістамі, і яны задавалі два пытанні, якія не могуць зразумець дагэтуль у сваёй галаве: чаму такія вялікія лічбы падтрымкі нашага Прэзідэнта? Я патлумачыў, што ў іх у Вялікабрытаніі не нацыянальны лідар. Дзякуючы нейкім кампрамісам і дамоўленасцям з элітамі ў вас ёсць кіраўнік краіны, а ў нас — нацыянальны лідар. Таму нават прыхільнікі тых партый, якія ўдзельнічалі ў выбарах, галасавалі за дзеючага Прэзідэнта. Ён усіх аб'ядноўвае.**

Другое пытанне: чаму барацьба на выбарах была не вострая? Я ўдакладніў у іх, што яны пад гэтым паняццем маюць на ўвазе. Выхад на вуліцу ці плошчу, непрызнанне выбараў з боку кандыдатаў і спробы расхістаць краіну? У адказ яны прамаўчалі. Гэта значыць, насамрэч яны выдатна разумеюць, што ў нас выбары дэмакратычныя. Больш за тое, я сустракаўся з шэрагам еўрапейскіх назіральнікаў, у тым ліку са старшынёй польскай партыі «Фронт». Ён мне ў адкрытую сказаў: «Нам бы ў Польшчы такія выбары. Я нават не ведаю, ці дапусціць мяне да іх са сваёй пазіцыяй супраць санкцый, вайны».

Таму я хачу сказаць яшчэ адну важную думку: гэтыя выбары ўмацавалі краіну. Успомніце 2020 год, калі ўжо ноччу былі беспарадкі, некаторыя баяліся ісці дадому, кагосьці ўжо збілі.

На гэтых выбарах, напрыклад, раніцай краіна стала жыць звычайным жыццём. Гэта значыць, мы прачнуліся мацнейшымі. Гэтыя выбары не аслабілі нас. І дай бог, каб усе наступныя выбары былі такія ж.

## АДЧУЙЦЕ РОЗНІЦУ!



**Дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ** у эфіры ток-шоу «Будні» адзначае, што вялікі працэнт галасоў за дзеючага прэзідэнта — гэта сведчанне таго, што грамадзяне Беларусі выдатна ўсведамляюць, наколькі была важная гэтая кампанія:

**— Мы бачым, што сітуацыя на межах краіны была вельмі цяжкай і напружанай, нас пастаянна чымсьці палохалі, улады Беларусі былі вымушаны на гэта рэагаваць. Нашы ворагі і апаненты, якія знаходзяцца за мяжой, усяляк спрабавалі запрацівіцца волевыяўленню беларускага народа, выдатна разумеючы, чым гэта скончыцца. Усе кажуць: выбары былі сумныя, прадказальныя. У чымсьці з імі нельга не пагадзіцца, таму што хто, акрамя цяперашняга дзеючага кіраўніка дзяржавы, які мае ў нашым грамадстве такую падтрымку, у каго настолькі выверанны і правераны дзесяцігоддзямі курс, які не дае збояў і дазваляе краіне развівацца?**

І, вядома ж, ва ўмовах знешніх праблем і турбулентнасці нікому не хочацца мяняць ужо выверанны курс, які дае станоўчыя вынікі, на ката ў мяшку (невядомага лідара), які можа абяцаць усё што заўгодна, але не факт, што зможа выканаць гэта на практыцы.

Па словах палітолага, у беларусаў хапае грамадзянскай разважнасці і наша грамадства — палітычна спелае, каб прымаць правільныя рашэнні:

— Мы сёння бачым тое, як лёгка страціць заваяванае і нажытае непасільнай працай, краіну і жыццё грамадзян, дабрабыт, як лёгка страціць суверэнітэт, адзін раз аддаўшы яго, прайграўшы выбары, а потым мучыцца дзесяцігоддзямі. Таму што гэтыя часовыя кіраўнікі, пастаўленыя кімсьці і якія мараць аб узбагачэнні, залежныя, яны выконваюць волю сваіх заакіянскіх спонсараў, расцягваюць не толькі дзяржавы, але і цэлыя глабальныя рэгіёны.

У прыклад дэкан факультэта журналістыкі БДУ прывёў еўрапейскі кантынент, які і быў «прайграны»:

— Калісьці ён быў сімвалам дабрабыту, росквіту, найвышэйшых дасягненняў, у тым ліку і ў галіне сацыяльнай палітыкі. А што цяпер па факце там адбываецца? Мы бачым, як пастаянна руйнуюцца еўрапейскія краіны, якія ўцягнуты ў гонку ўзбраенняў, прамы ваенны канфлікт ва Украіне, дзе з дня ў дзень увесь час пагаршаецца сацыяльны дабрабыт грамадзян.




ГОЛАС ВЫБАРШЧЫКАЎ

# «Я ХАЧУ І ДАЛЕЙ НАЗІРАЦЬ, ЯК МЯНЯЕЦЦА ДА ЛЕПШАГА МАЯ РАДЗІМА»

**Таццяна Мікуліч, жыхарка Мінска:**

— На гэтых выбарах я свядома галасавала за Аляксандра Лукашэнку. Прычым рабіла гэта не першы раз і абсалютна асэнсавана. Хаця, згадваючы нашы першыя прэзідэнцкія выбары (а мне было якраз дваццаць гадоў), я абсалютна не была прыхільніцай гэтага кандыдата. Па маладосці заманлівыя словы «свабода», «дэмакратыя» здаваліся асновай жыцця, нават калі жыццё гэта будзе напаўгалодным. Памятаю, нават спрачалася з бацькамі, якія галасавалі за Лукашэнку, спадзеючыся, што жыццё стане лепшым.

Я вельмі добра памятаю той момант, калі я стала прыхільніцай нашага Прэзідэнта. Гэта былі выбары 2010 года, я тады ішла на іх і збіралася галасаваць за іншага кандыдата. Але, пакуль ішла, стала думаць і аналізаваць (мазгі ўжо ўключыліся). У свае трыццаць шэсць я, вясковая дзяўчынка, мела ўжо ўсё: добрую работу, машыну, кватэру. Прычым мне ніхто не дапамагаў, у мяне была магчымасць зарабіць усё самой. У маёй маленькай вёсцы, якая, здавалася, вось-вось знікне, пачало наладжвацца жыццё, на месцы паўразбураных кароўнікаў паўстала новае прадпрыемства, заасфальтавалі вуліцу, на палях, якія зараслі бур'янам, з'явіліся новыя трактары. Я перастала дапамагаць бацькам з зарплаты, ім стала хапаць пенсіі, прынамсі на ўсё патрэбнае... Якраз у той год я двойчы з'ездзіла на мора, і мне не давялося пазычаць ці асабліва эканоміць... Я зразумела раптам, што жыць у Беларусі становіцца з кожным годам лепш, што трэба пачынаць вучыцца ганарыцца сваёй краінай. Што я сама маю да гэтага дачыненне, у тым ліку і ідучы на выбары. І менавіта тады я першы раз паставіла ў бюлетэні «птушачку» насупраць прозвішча «Лукашэнка».

З таго часу сумненняў у мяне не было ніколі — нават у вар'яцкім 2020-м. Я хачу і далей назіраць, як мяняецца да лепшага мая Радзіма, адчуваць далучанасць да гэтага і гонар за сваю краіну.

## «Наша грамадства — палітычна спелае, каб прымаць правільныя рашэнні»: эксперты — пра вынікі выбараў Прэзідэнта

Мы ў Беларусі гэта бачым, да нас даходзіць гэтая інфармацыя, мы яе распаўсюджваем (таму што нашы людзі павінны ведаць праўду). Больш за тое, цяпер у грамадстве няма межаў. Блогі, сацсеткі — гэта велізарная прастора, у якой свабодна цыркулюе інфармацыя, нашы грамадзяне з усім знаёмяцца, усё бачаць, маюць магчымасць параўнаць сябе і еўрапейцаў.

Так і атрымаўся заканамерны вынік, што людзі не захацелі губляць сваю краіну, свабоду і дабрабыт, таму яны масава прыйшлі на ўчасткі, вельмі многія — на датэрміновае галасаванне.

### БЕЛАРУСЫ ВЫБРАЛІ СВОЙ ШЛЯХ

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА** адзначае, што заходнія палітыкі і журналісты не ведаюць і таму не разумеюць спецыфікі нацыянальнай псіхалогіі беларускага народа. Адсюль тыя памылкі, якія заходнікі вельмі часта допускаюць у дачыненні да нашай краіны, уключаючы імкненне абмежаваць развіццё Беларусі, яе эканамічна патэнцыялу, грамадства і дзяржавы ў цэлым:



— Галасаванне ў асноўны дзень яшчэ раз прадэманстравала прыхільнасць нашага народа палітычнаму курсу на ўмацаванне міру і бяспекі, народнага адзінства і паляпшэнне якасці жыцця кожнага чалавека.

Парламентарый падкрэслівае: беларусы выбралі свой, гістарычна наканаваны шлях пабудовы нашага агульнага дома:

> **— Усе разважлівыя палітыкі свету пераканаліся сёння: беларусы правялі электаральную кампанію без парушэнняў нацыянальнага і міжнароднага заканадаўства, дэмакратычна і свабодна. Справядлівыя выбары прайшлі ў спакойнай палітычнай абстаноўцы. Падкрэсліваю — у спакойнай!**

Парламентарый дадаў:

— Мы на нарматыўным прававым узроўні выключылі любы фінансавы ўплыў замежных падрыўных інфармацыйна-псіхалагічных цэнтраў на палітычныя працэсы ў Беларусі. Іншымі словамі, праз межы нашай рэспублікі не пранік ні адзін «асёл, гружаны золатам». Заканадаўцы прынялі абсалютна правільнае рашэнне, забараніўшы замежнае фінансаванне электаральных кампаній, якое вельмі часта ажыццяўлялася пад «чужым сцягам» — праз сотні грамадскіх і няўрадавых арганізацый, афіляваных з заходнімі спецслужбамі.

Алег Дзячэнка тлумачыць простую арыфметыку: няма заходніх грошай — значыць, няма і палітычнага цырка на беларускіх вуліцах і плошчах:

— Беларусы самастойна, без ціску звонку, зрабілі свой палітычны выбар, абралі народнага прэзідэнта і абаранілі электаральны суверэнітэт!

### МОЛАДЗЬ — ЗА РАЗВІЦЦЁ!

**Член Савета Рэспублікі, старшыня Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** канстатуе: гэтымі днямі гучыць вельмі шмат ацэнак прысутных на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — 2025 назіральнікаў, і ў тым ліку ад маладзёжнай аўдыторыі:



— На базе Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ» у нас адбылася сустрэча з прадстаўнікамі назіральнай місіі, акрэдытаванай у нашай краіне, са Швейцарыі: гэта дэпутаты, старшыня грамадскай арганізацыі «Моладзь за сям'ю і шлюб», якія адзначылі транспарэнтнасць, празрыстасць і высокі ўзровень яўкі нашай моладзі.

Паводле яго слоў, многія назіральнікі адзначаюць нашы выбары як прыклад для пераймання па правядзенні электаральных кампаній у іх дзяржавах і ў тым ліку краінах Еўрапейскага саюза.

> **— Вядома, такі вынік немагчыма было дасягнуць толькі падрыхтоўкай электаральнага цыкла. Гэта сапраўды вынік планамернай работы з моладдзю. І, вядома, яркая лічба — 95 % упершыню галасуючых грамадзян нашай краіны — паказвае і пацвярджае сталы ўзровень палітычнай культуры нашай дзяржавы. Мы з калегамі не толькі абмеркавалі ўмовы па адкрытасці электаральных працэсаў, але і абмяняліся вопытам і практыкамі работы з моладдзю.**

## «ЗА БАЦЬКУ, ЗА КАГО Ж ЯШЧЭ!»

**Аляксей Дамарацкі, жыхар Самахвалавічаў:**

— За што я галасаваў, выбіраючы Аляксандра Лукашэнку? Хтосьці б сказаў: за сацыяльную палітыку, якая праводзіцца ў краіне пад яго кіраўніцтвам. А ў маім выпадку — я галасаваў літаральна за ўласнае жыццё. Так здарылася, што я правёў у рэанімацыі два месяцы, урачы літаральна выцягнулі мяне з таго свету... Пасля, ужо выпісаўшыся, я даведаўся, што суткі знаходжання ў рэанімацыі каштуюць тысячу сто рублёў. Я ж за лячэнне і рэабілітацыю не заплаціў ні капейкі. Ды і не толькі ў грашах справа — калі б не мэтанакіраваная падтрымка дзяржавы развіцця медыцыны, калі б не было такога сучаснага медыцынскага абсталявання, — нават найлепшыя ўрачы мяне наўрад ці паставілі б на ногі.

А суседу майму, які, яшчэ малады, ужо ледзь хадзіў, нядаўна замянілі сустаў. Таксама абсалютна бясплатна. Цяпер бегае. Пытаюся: за каго галасаваў? За Бацьку, адказвае, за каго ж яшчэ!

КАНТЭКСТ

## «ІХ ТРАЙНЫЯ СТАНДАРТЫ ТЫРЧАЦЬ З УСІХ ШЧЫЛІН»

**Не прызнаць нашы выбары ў ЕС хацелі з помпай і гучна — у выглядзе сумеснай заявы краін Еўрапейскага саюза. Але, як кажуць, штосьці пайшло не так: Венгрыя заблакавала прыняцце адпаведнага рашэння. Таму пазіцыю ЕС вымушаны былі агучваць толькі кіраўнік еўрапейскай дыпламатыі і еўрапейскі камісар па пытаннях пашырэння і палітыкі добрасуседства...**



Тым не менш, нават у такім куцым апублікаванні заява краін ЕС не прайшла незаўважанай і атрымала годны адказ ад нашага знешнепалітычнага ведамства. «Са шкадаваннем адзначаем працяг беспадстаўнай крытыкі Беларусі з боку асобных заходніх краін з выкарыстаннем клішаваных цэтлікаў і санкцыйных пагроз, — адзначылі ў МЗС Беларусі. — Вымушаны канстатаваць, што гэта заява наўмысна скажае факты, не ўлічвае аб'ектыўных рэалій у Беларусі і свеце. Прычым такая рыторыка выкарыстоўваецца на фоне ўласных сістэмных праблем, нарастальнай унутранай раз'яднанасці, дэградацыі пазіцый на міжнароднай арэне так званага калектыўнага Захаду». У МЗС заявілі: «Працяг і нарошчванне санкцыйнага ціску, тупіковасць і контрпрадукцыйнасць якога ўжо даўно не выклікае сумненняў, не паўплывае на выбраны грамадзянамі Беларусі курс».

**Міністр замежных спраў Максім РЫЖАНКОЎ** у інтэрв'ю выданню «Известия» выказаўся з гэтай нагоды больш катэгарычна: «Яны даўно ўжо зразумелі, як развіваецца сітуацыя ў нашай краіне, наколькі праводзіцца стабільная сацыяльна-палітычная і эканамічная лінія і што ва ўмовах прадастаўлення грамадзянам рэальнага выбару пераможа дзейны кіраўнік дзяржавы. Але гэта ў іх планы ж не ўваходзіць», — заўважыў дыпламат.

> **«Сёння ўся матрыца прызнання або непрызнання выбараў у заходніх краінах зводзіцца да таго, ці перамаглі тыя кандыдаты, якія потым прывядуць тую ці іншую краіну ў зону кіравання або ўплыву калектыўнага Захаду. І калі гэта не праглядаецца, то адразу ж на гэтую дзяржаву накідваюць цэлую кучу ярлыкоў аб тым, што нібы выбары былі не свабодныя, не было плюралізму меркаванняў і гэтак далей. Нават калі сёння спакойная сітуацыя, нават калі заканадаўства дазваляе правесці гэтыя выбары і адміністрацыйна створаны ўсе ўмовы, паверце, там усё роўна знойдуць, за што зачапіцца», — сказаў Максім Рыжанкоў.**

У той жа час ён падкрэсліў, што знешняе ўздзеянне не аказала ўплыву на беларусаў: «Мы самі бачылі, што ў людзей быў настрой прыйсці, прагаласаваць за захаванне той стабільнай сістэмы, якая ёсць у краіне. Як гаворыць Прэзідэнт, мы праводзім выбары для нашага народа. І вось самы галоўны паказчык паспяховасці выбараў — гэта наш народ. Той працэнт, які прыйшоў на ўчасткі, і той працэнт, які прагаласаваў за дзейнага Прэзідэнта нашай краіны».

Асабліва істэрычна з нагоды беларускіх выбараў і ўвогуле ў адносінах да нашай краіны ў ЕС паводзяць сябе нашы суседзі. « Польшча, Літва, Латвія — гэтыя краіны сябе паводзяць як увогуле прайграўшыя гульцы, якія пры гэтым у апошнія гады ставяць на пройгрыш Расіі і нашай рэспублікі, — ацэньвае іх паводзіны Максім Рыжанкоў. — Але штораз іх стаўка прайграе, яны ўсё больш падстаўляюць свае народы, пагаршаюць становішча сваіх краін, эканамічна адводзяць свае дзяржавы ад нармальнага развіцця, ад нармальных партнёраў, такіх як Расія, Беларусь, Кітай, краіны СНД».

Пры гэтым ступень кіпення ў Польшчы, Літве і Латвіі, заявіў міністр, кожны раз нарастае, нервовасць павялічваецца. У прыклад ён прывёў апошнія заявы міністра замежных справаў Польшчы.

> **«Навошта тады такі істэрызм, такі эмацыйны надрыў у вашых ацэнках сітуацыі? Значыць, не атрымліваецца нешта, значыць, ёсць у польскіх, літоўскіх, латышскіх палітыкаў разуменне таго, што рана ці позна давядзецца адказваць за страчаныя гады супрацоўніцтва з Расіяй, Беларуссю, Кітаем, якія б далі ім прыстойны імпульс у развіцці гандлёва-эканамічнага становішча, у стварэнні працоўных месцаў», — перакананы кіраўнік МЗС.**

Тым часам многія краіны ядра старой Еўропы праяўляюць усё большую цікавасць да аднаўлення гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з нашай краінай, заўважыў Максім Рыжанкоў. «Гэта бачна па правядзенні розных мерапрыемстваў паміж прадпрымальнікамі нашых краін. Па лініі гандлёвых і прамысловых палат, палат бізнесу». Ды і тыя, хто гучней за ўсіх цяўкае на нашу краіну з-за граніцы, у баку не застаюцца. «Нягледзячы на ўсе санкцыі, каля $8 млрд — гэта сума нашага гандлю з Еўрапейскім саюзам, — расказаў расійскаму выданню Максім Рыжанкоў. — І самае цікавае, што ў гэтай суме большасць пазіцый належыць тым дзяржавам, якія стаяць ля асноў крытыкі Беларусі і разгортваюць антыбеларускую рыторыку ў Еўрапейскім саюзе. Гэта значыць яны там заклікаюць да санкцый, кажучы аб нелегітымнасці нашай улады, а пад шумок прыгандлёўваюць?»

Што ж, як кажуць, сабакі брэшуць, а караван ідзе. Як трапна заўважыў з гэтай нагоды адзін з кандыдатаў у Прэзідэнты, «іх трайныя стандарты тырчаць з усіх шчылін». Беларусам да гэтага, як і Прэзідэнту, якога яны выбралі, «фіялетава». А вось калі іхнія ўласныя народы гэта зразумеюць, камусьці тады не пазайздросціш...



## «МАСКАТ ДЭМАНСТРУЕ ЦІКАВАСЦЬ ДА БЕЛАРУСІ»

**Наша краіна разглядае Аман як перспектыўны рэгіянальны хаб па прасоўванні айчынных тавараў у краіны Афрыкі, Азіі і Блізкага Усходу**

Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка днямі правёў нараду па пытаннях выканання даручэнняў Прэзідэнта па выніках візіту ў Аман, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Падчас нарады кіраўнік урада адзначыў:

— Маскат дэманструе адкрытасць і цікавасць да Беларусі, у прыватнасці да рэалізацыі сумесных праектаў, арыентаваных у тым ліку на трэція краіны.

На нарадзе прадметна разгледжаны падыходы да рэалізацыі кожнага з кірункаў гандлёва-эканамічнага і гуманітарнага ўзаемадзеяння, вызначаных падчас сустрэч на вышэйшым узроўні.

Як падкрэсліў прэм'ер-міністр, важна абмеркаваць, што ўжо зроблена, як выбудавана работа па ўзаемадзеянні з аманскімі партнёрамі, якія праблемныя пытанні ёсць і якія рашэнні неабходна прыняць для рэалізацыі дасягнутых у ходзе візіту Прэзідэнта дамоўленасцяў у поўным аб'ёме.

* * *

## УРАД ПЕРАЛІЧЫЎ СТАЎКІ ЎТЫЛІЗАЦЫЙНАГА ЗБОРУ

Адпаведную пастанову падпісаў днямі прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка.



Як удакладнілі ў прэс-службе ўрада, дакументам прадугледжаны:

— пералік ставак утылізацыйнага збору, які выплачваецца як фізічнымі, так і юрыдычнымі асобамі на транспартныя сродкі, якія вырабляюцца ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама транспартныя сродкі, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, і самаходныя машыны і (або) прычэпы да іх, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі;

— «выраўноўванне» ставак утылізацыйнага збору са стаўкамі, якія дзейнічаюць у Расійскай Федэрацыі, з 1 студзеня 2025 года;

— удакладненне парадку ўзгаднення набыцця транспартных сродкаў.

У Саўміне дадалі, што пастанова ўступае ў сілу праз 10 дзён пасля яе афіцыйнага апублікавання.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# КАШТОЎНАЯ ПАРАДА І РЭАЛЬНАЯ ДАПАМОГА

**Наталля КАЧАНАВА правяла прыём грамадзян**



Фота БелТА.

**Пытанні, з якімі людзі звярталіся да Старшыні Савета Рэспублікі, традыцыйныя. Гэта і стан дарожнага пакрыцця ў сельскай мясцовасці, і зямельныя спрэчкі, якія не атрымліваецца вырашыць з прыцягненнем мясцовых улад. У топе праблем, якія хвалююць грамадзян, — паляпшэнне жыллёвых умоў, якасць праведзеных падчас капітальнага рамонту работ, працаўладкаванне. Неабыякавыя грамадзяне закранулі пытанне патрыятычнага выхавання моладзі, выказалі гатоўнасць дапамагаць хворым дзецям і іх бацькам.**

## «ДАВЕР ТРЭБА АПРАЎДВАЦЬ»

Павел Мікалаевіч звярнуўся з пытаннем, якое хвалюе жыхароў вёсак Іканы і Ганцавічы Барысаўскага раёна. Па яго словах, дарогі ў населеных пунктах патрабуюць капітальнага рамонту. «У вёсцы Іканы ў час вясенняга разводдзя дарогі пераўтвараюцца ў пастападобную масу, — канкрэтызаваў грамадзянін. — Можа, з эканамічнага пункту гледжання іх няма сэнсу аднаўляць, але там жывуць людзі».

Як праінфармаваў **старшыня Барысаўскага райвыканкама Мікалай КАРПОВІЧ,** населеныя пункты, аб якіх ідзе размова, у план найбліжэйшага рамонту не ўключаны.

«Павел Мікалаевіч звярнуўся да мяне як да даверанай асобы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Гэтае пытанне будзе знаходзіцца на кантролі ў мяне і ў Прэзідэнта. Таму трэба зрабіць так, каб гэтыя дарогі таксама былі праязнымі. Не гліна і балота, а так, каб людзі маглі ездзіць. Трэба рабіць. Буду трымаць гэта на кантролі. І я туды прыеду. Таму наводзьце там парадак, а мы пракантралюем».

Акрамя таго, спікер звярнула ўвагу на якасць рамонту дарог, бо за гэтым — дзяржаўныя грошы. «А то скардзяцца, што людзі не жывуць у сельскай мясцовасці, — дадала Наталля Качанава. — Людзі, калі ўбачаць, што там нармальна, прыедуць і будуць жыць. Трэба знайсці магчымасць і зрабіць дарогу. Людзі аказалі нам давер — і давер трэба апраўдваць».

## ЗЯМЕЛЬНЫЯ СПРЭЧКІ — ЗАКАНАДАЎЧЫЯ РАШЭННІ

Ірына Леанідаўна са Слуцка паскардзілася на тое, што плошча яе зямельнага ўчастка не адпавядае першапачатковаму памеру. Жанчына расказала, што зямельны ўчастак быў выдзелены ў 1947 годзе яе дзеду, ветэрану вайны. Цяпер там пражывае яна.

Як патлумачыў **начальнік галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання Мінскага аблвыканкама Сяргей ШЫМУК,** каб заяўніцы разабрацца ў праблеме, трэба звярнуцца ў спецыялізаванае падраздзяленне БТІ і афіцыйна аднавіць межы на мясцовасці.

Наталля Качанава даручыла ўзяць гэтае пытанне на кантроль аднаму з сенатараў. «Трэба разабрацца», — падкрэсліла яна.

Жыхарка Слуцкага раёна Ніна Арсенцьеўна таксама паскардзілася на тое, што суседзі, прычым з абодвух бакоў, «забралі» ў яе па некалькі метраў. Як паведаміў Сяргей Шымук, зямельная спрэчка разгледжана і правы грамадзян — і з аднаго, і з другога боку — зарэгістраваны. Наталлю Качанаву такі адказ не задаволіў. Даручэнне разабрацца ў сітуацыі з выездам на месца дадзена Дзяржаўнаму камітэту па маёмасці. Савет Рэспублікі, у сваю чаргу, будзе трымаць зварот на кантролі.

Вікторыя Валер'еўна ўзняла пытанне легалізацыі самавольна занятага ўчастка ў Дзяржынскім раёне. На тэрыторыі, якую доўгі час лічылі сваёй уласнасцю, сям'я пабудавала дом. Як пасля высветлілася, гэты ўчастак сям'і не належыць. Каб узаконіць зямлю, якая аказалася самавольна занятай, заяўніцы прапаноўваюць зносіць дом, афарміць участак ва ўласнасць і толькі тады ажыццяўляць там будаўнічыя работы.

Наталля Качанава даручыла разабрацца з гэтым пытаннем згодна з заканадаўствам і задала слушнае пытанне: «Куды глядзеў старшыня сельскага Савета, калі будаваўся дом? Дзе былі службы, якія павінны былі кантраляваць самавольнае будаўніцтва на нявыдзеленай тэрыторыі? Можа, віна Вікторыі Валер'еўны ў гэтым і ёсць, але не меншая віна і мясцовых органаў улады».

## «ТРЭБА ДАПАМАГЧЫ»

Вольга Валер'еўна паскардзілася на тое, што яе хочуць выселіць з інтэрната, у якім яна жыве больш за дзесяць гадоў. Пакой у інтэрнаце, які належыць ААТ «Мінсксельбуд», выдаваўся яе былому сужэнцу, які працаваў на адным з прадпрыемстваў арганізацыі. Паколькі жанчына знаходзіцца з мужам у разводзе, яна не мае права займаць пакой у інтэрнаце. Заяўніца ўсё гэта разумее, але не ведае, куды ёй пайсці з двума малымі дзецьмі.

**Намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Віктар РАГУСКІ** адзначыў, што кіраўніцтва вобласці з разуменнем ставіцца да сітуацыі, але заяўніца не хоча нічога мяняць: ёй прапануюць працу і, адпаведна, жыллё. Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што абласная ўлада тут мае рацыю: інтэрнат ведамасны, а таму там павінны жыць тыя, хто працуе на гэтых прадпрыемствах. «З горадам вырашыце гэтае пытанне: няхай яны вашаму супрацоўніку дадуць інтэрнат, а тут захавайце за ёй пакой, — прапанавала яна. — Падумайце, але трэба дапамагчы».

З жыллёвым пытаннем прыйшла на прыём і шматдзетная маці Крысціна Юр'еўна. У Бараўлянскім сельскім Савеце стаіць на чарзе тых, што мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Заяўніца папрасіла патлумачыць, чаму за 2024 год сям'я не прасунулася ў чарзе.

Віктар Рагускі расказаў, што сям'я знаходзіцца на чарзе пад нумарам 1218. «Гэта нядрэнна, няхай вас лічба не палохае, — патлумачыў ён. — У 2025 годзе вы будзеце накіраваны на паляпшэнне жыллёвых умоў».

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, на працягу года шматдзетная сям'я павінна быць запрошана на будаўніцтва жылля. «Можаце не хвалявацца, мы возьмем ваша пытанне на кантроль», — запэўніла спікер.

Заяўніца падзякавала і паскардзілася на некампетэнтнасць шэрагу супрацоўнікаў, якія далі ёй няправільную інфармацыю. Наталля Іванаўна праінфармавала, што цяпер сур'ёзная ўвага будзе ўдзяляцца адносінам службовых асоб да людзей. «Паглядзім, калі будуць такія факты, будзем вельмі жорстка разбірацца, — падкрэсліла яна. — Чалавеку нельга грубіць! А яшчэ важна, каб правільна кансультавалі, каб спецыялісты былі кампетэнтныя».

## «РАЗЛІЧВАЙЦЕСЯ З ЧАЛАВЕКАМ»

Індывідуальны прадпрымальнік з Асіповіцкага раёна расказаў, што трапіў у безвыходнае становішча. Ён, грамадзянін Казахстана, прыехаў у Беларусь 10 гадоў таму і застаўся назаўсёды. Каб забяспечваць шматдзетную сям'ю, купіў трактар «Амкадор» і пачаў супрацоўнічаць з мясцовым сельгаспрадпрыемствам. Апошняе не разлічылася з індывідуальным прадпрымальнікам.

Як патлумачыў па відэа-канферэнц-сувязі **першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР,** сельгаспрадпрыемства, аб якім ідзе размова, знаходзіцца ў няпростай фінансавай сітуацыі.

«Складайце графік і разлічвайцеся з чалавекам, — паставіла задачу Наталля Качанава. — Мы ставім гэтае пытанне на кантроль».

## «ВЫСНОВЫ ЗРОБЛЕНЫ, АЛЕ СПЫНЯЦЦА НЕЛЬГА»

Неабыякавыя мінчане ўзнялі пытанне патрыятычнага выхавання моладзі. На іх погляд, тут ёсць некаторыя недахопы, у прыватнасці, маладое пакаленне, па меркаванні заяўнікаў, «заражана толькі матэрыяльным», і прапанавалі вярнуцца да вопыту Савецкага Саюза, калі ўсе знаходзіліся ў роўных умовах.

Старшыня Савета Рэспублікі ў пэўнай ступені пагаджаецца з заяўнікамі, але лічыць, што пытанне не стаіць так востра. «Высновы зроблены, і ўжо шмат здзейснена за гэты час, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — У нас з'явіліся добрыя маладзёжныя структуры. Зроблена ўсё тое, што накіравана на патрыятычнае выхаванне нашага грамадства. Але спыняцца нельга».

Марына Анатольеўна прапанавала сацыяльны праект для дзяцей з цукровым дыябетам. У яе з уласнага вопыту нямала рэкамендацый, як аблегчыць, стабілізаваць стан і дзяцей, і дарослых, захоўваць маральную раўнавагу. У жанчыны — вялікае жаданне гэтым займацца.

Наталля Качанава выказала ўдзячнасць за такую прапанову. Старшыня Савета Рэспублікі падтрымлівае, што трэба ствараць умовы, каб дзеці з такім захворваннем былі адаптаваны ў грамадства. Спікер паставіла задачу адпрацаваць гэтае пытанне міністэрствам аховы здароўя, працы і сацабароны і ўнесці прапановы.

**Вераніка КАНЮТА.**

Ігар СЕРГЯЕНКА:

# «ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ — ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ»

**Прэзентацыя кнігі «Наш Прэзідэнт» прайшла ў Палаце прадстаўнікоў**



Фота БелТА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў сустрэліся з аўтарамі кнігі «Наш Прэзідэнт» Аляксандрам Радзьковым і Аляксандрам Карлюкевічам. «Сімвалічна, што сустрэча праходзіць сёння, калі беларускі народ аказаў дзейнаму кіраўніку дзяржавы высокі давер, пацвердзіўшы прыхільнасць курсу на будаўніцтва моцнай і суверэннай Беларусі. Створанае за гады незалежнасці новае аблічча краіны, па сутнасці, абумовіла вынікі галасавання», — адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка. Сімвалічным ён назваў і месца сустрэчы — Авальная зала Дома ўрада — сапраўды знакавае месца і для Рэспублікі Беларусь, і для яе Прэзідэнта. З гэтай залай звязана і дэпутацкая дзейнасць Аляксандра Лукашэнкі, з гэтай трыбуны ён выступае са штогадовым пасланнем беларускаму народу і парламенту.




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Ігар Сергяенка выказаў упэўненасць, што сёння, калі краіна ўступае ў новы этап свайго развіцця, кніга «Наш Прэзідэнт» выклікае жывую цікавасць у грамадстве.

**«Шчыра кажучы, даволі часта даводзілася чуць ад многіх калег і выбаршчыкаў аб запатрабаванасці такога выдання. Жыццёвы шлях нашага кіраўніка дзяржавы — прыклад для пераймання і арыенцір не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой», — адзначыў спікер.**

Асобна Старшыня Палаты прадстаўнікоў заўважыў, што кніга «Наш Прэзідэнт» падрабязна і цэласна адлюстроўвае асноўныя этапы станаўлення асобы Прэзідэнта Беларусі. «Хачу падкрэсліць, што кніга таксама мае багатую гістарычную каштоўнасць. У ёй сабрана вялікая колькасць матэрыялаў і фатаграфій, многія з якіх публікуюцца ўпершыню. Гэта своеасаблівы фоталетапіс Беларусі апошніх дзесяцігоддзяў», — дадаў ён.

Аўтары расказалі пра тое, як ішла работа над кнігай, што было самым складаным на гэтым шляху. І падзяліліся, як гэта — пісаць кнігу пра Прэзідэнта, як у адным выданні сумясціць не толькі біяграфію аднаго чалавека, але і адлюстраваць лёс суверэннай краіны. «Вельмі складаная задача — пісаць кнігу аб лідары нацыі, аб Прэзідэнце, аб яго інтэлекце, яго развагах. Аднаму такі праект не асіліць, патрэбны аператыўнасць, пэўны досвед, стрыжань, філасофскае адчуванне, архівы, фотаздымкі. Аўтарскі калектыў — гэта таксама Наталля Эйсмант, Уладзімір Пярцоў, якія ўклалі ў працу шмат цікавых і значных ідэй. Гэта быў не адзін год напружанай, творчай работы, у абмеркаваннях, спрэчках. Але мы рабілі гэта вельмі адказна і самааддана», — падзяліўся Аляксандр Радзькоў.

Аляксандр Карлюкевіч у працяг думкі свайго калегі адзначыў лаканічна: «Кніга атрымалася». Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар выдавецтва «Беларусь» расказаў, што кніга «Наш Прэзідэнт» вельмі запатрабавана ў чытачоў. «Велізарная колькасць заявак на яе, друкарня нават не паспявае адгружаць. Але яны задавальняюцца. Таму кожны дзень з'яўляецца кніга ў краме «Светач» і, вядома ж, ва ўсіх крамах «Мерч Першага». З часам, літаральна на працягу тыдня, кніга з'явіцца ў рэгіёнах краіны. Ужо пачынаюць бібліятэкі запытваць, прадстаўляць свае заяўкі. Кніга будзе даступна кожнаму чытачу, кожнаму грамадзяніну нашай краіны», — адзначыў Аляксандр Карлюкевіч.

Парламентарыі спыталі, ці чакаць у будучыні другога падобнага выдання. Аляксандр Радзькоў заўважыў, што калі такая запатрабаванасць будзе, то зрабіць яго можна. Але, звярнуў увагу ён, кніга павінна саспець.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін расказаў журналістам, што азнаёміцца з кнігай «Наш Прэзідэнт» ужо можна ў Нацыянальнай бібліятэцы. Таксама ў рамках праекта НББ «Веды без межаў», калі «алмаз ведаў» дзеліцца кнігамі з абласнымі і раённымі бібліятэкамі, гэтая кніга будзе перададзена ў абласныя бібліятэкі. Вадзім Гігін падзяліўся і сваімі ўражаннямі ад кнігі «Наш Прэзідэнт»: «Безумоўна, гэта не цалкам уся біяграфія нашага Прэзідэнта — там спатрэбіцца, мусіць, шматтомнік. Гэта вельмі ўдалая аўтарская спроба прадставіць праз асобу выдатнага дзяржаўнага дзеяча той шлях, які прайшла наша незалежная, суверэнная краіна за гэтыя гады». Парламентарый назваў гэта выданне сур'ёзнай гістарычнай крыніцай, фотадакументам.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# У КАМБАЙНЕРЫ — З 17 ГАДОЎ

**Новы законапраект дазволіць працаваць у сельскай гаспадарцы навучэнцам другога курса**

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на пасяджэнні другой сесіі прынялі ў другім чытанні законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху». Дакумент накіраваны на ўдасканаленне грамадскіх адносін, якія ўзнікаюць пры атрыманні права кіравання колавым трактарам і самаходнай машынай.

У прыватнасці, праектам закона прапануецца зніжэнне ўзросту асобы, якая можа атрымаць права кіравання самаходнай машынай сельскагаспадарчага прызначэння (катэгорыя F), з 18 да 17 гадоў, і павелічэнне максімальна дапушчальнай магутнасці рухавіка для колавых трактароў і самаходных машын катэгорый C, D, E, F. Законапраектам таксама прадугледжана, што не спатрэбіцца замена раней выдадзеных вадзіцельскіх пасведчанняў на права кіравання колавым трактарам, самаходнай машынай.

Як растлумачыў журналістам **член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Сяргей ДАВЫДАЎ**, галоўная мэта законапраекта — павелічэнне кадравага патэнцыялу прадпрыемстваў сельскагаспадарчай галіны. «Гэтыя навацыі дадуць магчымасць прыцягнуць маладыя кадры з другога курса. Бо ўжо з 17 гадоў яны змогуць атрымаць правы кіравання такой вялікай і сур'ёзнай тэхнікай, як камбайны. Прапановы выказвалі сельгасарганізацыі, але ў большай частцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. З улікам прапановы, выказанай дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў у ходзе разгляду гэтага законапраекта ў першым чытанні, для аператыўнай рэалізацыі прапанаваных навацый у яго ўнесены змяненні, накіраваныя на скарачэнне тэрміну ўступлення ў сілу Закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху» з шасці месяцаў да двух. Наша камісія прыклала ўсе намаганні для таго, каб скараціць гэтыя тэрміны і як мага хутчэй укараніць законапраект у жыццё. І, такім чынам, маладыя людзі змогуць унесці свой уклад ва ўборачную кампанію, а можа, і ў пасяўную», — расказаў парламентарый.

**Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН** ад імя міністэрства падзякаваў дэпутатам за аператыўны разгляд і прыняцце законапраекта. Ён падкрэсліў, што гэты дакумент накіраваны на павышэнне эфектыўнасці вытворчай практыкі студэнтаў і навучэнцаў у сельгасарганізацыях, а таксама на паляпшэнне забеспячэння сельгасгаліны кадрамі механізатараў. «Падыходы, якія закладзены ў законапраекце, сфармуляваны Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання з улікам прапаноў, якія паступілі ад Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства ўнутраных спраў і іншых зацікаўленых дзяржаўных органаў», — сказаў ён. Уладзімір Гракун падзякаваў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў за скарачэнне тэрмінаў уступлення законапраекта ў сілу. «Гэта дасць магчымасць у сезон масавых палявых работ задаволіць патрэбы ў дадатковай колькасці механізатарскіх кадраў за кошт прыцягнення практыкантаў ВНУ і каледжаў для выканання такіх сельгасаперацый, як узворванне, баранаванне, пасяўныя работы, культывацыя, апрацоўка, пасадка, нарыхтоўка зялёнай масы, уборка і вываз ураджаю. Гэта дасць магчымасць выконваць усе работы ў агратэхнічныя тэрміны, што будзе садзейнічаць захаванню ўраджаю», — адзначыў намеснік міністра.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ДОБРАЯ НАВІНА

# ПАВЯЛІЧАНА НАДБАЎКА ЎРАЧАМ-СПЕЦЫЯЛІСТАМ

**Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя**

У рамках планамернага павышэння памераў аплаты працы медыцынскіх работнікаў з 1 студзеня прадугледжана павелічэнне надбаўкі за работу ў сферы аховы здароўя ўрачам-спецыялістам на 45 % акладу. Так, надбаўка ўстаноўлена ўрачам-спецыялістам аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі, інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі — 300 % акладу, урачам-спецыялістам прыёмнага аддзялення — 235 % акладу, урачам-спецыялістам аддзяленняў (палат) для пацыентаў з парушэннем мазгавога кровазвароту (інсультам), з паражэннем спіннога мозгу, якія суправаджаюцца паралічамі канечнасцяў і парушэннем функцый тазавых органаў — 235 % акладу, урачам-спецыялістам выязных брыгад — 235 % акладу, урачам агульнай практыкі, урачам-педыятрам участковым, урачам-тэрапеўтам участковым — 235 % акладу, урачам-спецыялістам, за выключэннем вышэйпералічаных, — 185 % акладу.

**Алена КРАВЕЦ.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

**Извещение о проведении публичных торгов в форме электронного аукциона**

| | |
|---|---|
| Организатор электронного аукциона | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

**Вторые повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 14.01.2025 г. в г. «Звязда» № 7 (30395), стр. 10**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, с учетом НДС 20 % | Минимальная цена, с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение № 11 с инв. № 600/D-97611, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 62-11, р-н д. Лесковка. Общая площадь – 213,4 кв. м | 471 640,10 | 188 656,04 |
| 2 | Изолированное помещение № 10 с инв. № 600/D-97607, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 62-10, р-н д. Лесковка. Общая площадь – 20,1 кв. м | 53 102,50 | 21 241,00 |
| 3 | Изолированное помещение № 13 с инв. № 600/D-97612, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 62-13, р-н д. Лесковка. Общая площадь – 198 кв. м | 446 927,50 | 178 771,00 |
| 4 | Изолированное помещение № 5 с инв. № 600/D-97600, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 62-5, р-н д. Лесковка. Общая площадь – 5,9 кв. м | 16 027,90 | 6 411,16 |
| 5 | Изолированное помещение № 6 с инв. № 600/D-97601, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 62-6, р-н д. Лесковка. Общая площадь – 15,7 кв. м | 42 252,70 | 16 901,08 |
| 6 | Изолированное помещение № 7 с инв. № 600/D-97602, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 62-7, р-н д. Лесковка. Общая площадь – 32,4 кв. м | 82 438,30 | 32 975,32 |
| 7 | Изолированное помещение № 8 с инв. № 600/D-97604, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 62-8, р-н д. Лесковка. Общая площадь – 26,6 кв. м | 68 947,30 | 27 578,92 |
| 8 | Изолированное помещение № 9 с инв. № 600/D-97606, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 62-9, р-н д. Лесковка. Общая площадь – 14,8 кв. м | 39 844,30 | 15 937,72 |

**Задаток: 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота (не изменяется в ходе торгов)

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона) – 10 (десять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона), либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,7 % от конечной цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 10.02.2025 г. начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00. Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются с 30.01.2025 г. по 07.02.2025 г. до 16.00.
Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг **«Гродненский центр недвижимости»** вносит дополнение в извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка» г. Гродно 18 февраля 2025 года, опубликованное в газете «Звязда» от 23.01.2025:

«В соответствии с генеральным планом г. Гродно и детальным планом исторического центра г. Гродно с проектом регенерации исторической застройки, на территории участка ул. Замковая, 4 предполагается возведение (реконструкция) общественно-торгового объекта (группы объектов) с учётом сложившейся исторической пространственной среды и ограничений зон охраны историко-культурных ценностей».

УНП 590727594

# СВАЁ АЎТО

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Летась з канвеера завода сышло больш за 90 тысяч аўтамабіляў, з якіх звыш за 25 тысяч было прададзена ў Беларусі, распавяла **намеснік дырэктара па маркетынгу і продажах СЗАТ «БЕЛДЖЫ» Наталля Харкова.** Сёлета плануецца выпуск больш чым 30 тысяч аўтамабіляў для беларускага рынку, або на 10—15 % больш, чым у 2024-м. Прычына — высокі попыт на айчынным рынку, удакладнілі на прадпрыемстве.

## САПРАЎДЫ БЕЛАРУСКІ

Выгадныя механізмы крэдытавання называлі адным з фактараў росту продажаў новых легкавых аўтамабіляў у Беларусі ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю ў 2024-м. Нагадаем, што па выніках першага паўгоддзя мінулага года продажы новых легкавых аўтамабіляў у краіне выраслі амаль у 2,5 раза. Аўтамабільная асацыяцыя «БАА» адзначала павелічэнне продажаў легкавых аўтамабіляў і ў канцы мінулага года: у кастрычніку новенькіх аўто было прададзена каля 5 тысяч — амаль на сем сотняў болей, чым у верасні. Калі казаць менавіта пра аўтамабілі вытворчасці СЗАТ «БЕЛДЖЫ», то ўсяго на сёння ў Беларусі іх прададзена больш чым 70 тысяч. Праграмай крэдытавання за час яе дзеяння скарысталася больш як 33 тысяч фізічных асоб, якія і набылі практычна 50 % ад агульнага аб'ёму прададзеных на беларускім рынку айчынных аўтамабіляў. Тэрмін дзеяння праграм беларускіх банкаў па крэдытаванні на набыццё аўтамабіляў Belgee і Geely завяршыўся ў апошні дзень 2024 года, і практычна ўвесь студзень пакупнікі маглі разлічваць толькі на акцыі і зніжкі непасрэдна ад вытворцы. Ці прадоўжыцца крэдытаванне ў 2025-м, было незразумела: разлічаны гэты механізм быў на павышэнне спажывецкага попыту, а попыт гэты сёння ўжо высокі. Але дзякуючы рашэнню кіраўніка дзяржавы прагрaма крэдытавання банкамі фізічных асоб на набыццё айчынных аўто аднаўляецца.

**Belgee — сапраўды беларускае аўто, пачынаючы ад назвы брэнда і заканчваючы вытворчасцю.**



— Распаўсюджваецца яна ў 2025 годзе толькі на набыццё аўтамабіляў Belgee. Аўтамабілі Geely праграма крэдытавання не закранае. Гэта асноўнае адрозненне, — адзначыла намеснік дырэктара па маркетынгу і продажах СЗАТ «БЕЛДЖЫ».

Яна падкрэсліла, што Belgee — сапраўды беларускае аўто, пачынаючы ад назвы брэнда і заканчваючы вытворчасцю.

## ШТО ВЫБІРАЕ ПАКУПНІК?

Калі паразважаць пра перавагі пакупнікоў, то назваць канкрэтныя мадэлі-фаварыты не атрымаецца:

— Кожны аўтамабіль арыентаваны на свой спажывецкі сегмент, — патлумачыла Наталля Харкова. — Часцей сёння пакупнікі аддаюць перавагу красоверам, але ёсць і аматары седанаў.

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

# БЕСПІЛОТНЫ ТРАНСПАРТ, ШКАРПЭТКІ З БАМБУКУ

## Якія інавацыі ўкараняюць беларускія прамыслоўцы?

Больш за чвэрць валавога ўнутранага прадукту ў Беларусі фарміруе прамысловасць. Цяжкая прамысловасць, у прыватнасці машынабудаванне і станкабудаванне, вытворчасць прадуктаў харчавання і напояў, нафтапрадуктаў, гумавых, пластмасавых вырабаў і будаўнічых матэрыялаў, хімічная і фармацэўтычная галіны, дрэваапрацоўка, лёгкая прамысловасць, робяць найбольш важкі ўнёсак у эканоміку краіны. Сёлета на айчынных прадпрыемствах працягваецца работа, пачатая ў Год якасці, па мадэрнізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці, укараненні новых тэхналогій і інавацыйных рашэнняў.



## У 30-Я ГАДЫ ТРАНСПАРТ БУДЗЕ БЕСПІЛОТНЫМ

Улічваючы гэту тэндэнцыю, працуюць у Аб'яднаным інстытуце машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ужо сёння тут ствараюць беспілотны кар'ерны самазвал БелАЗ. У кар'ерах Кузбаса працуюць айчынныя самазвалы, на якіх у рэальным часе адсочваецца рэсурс, які застаўся да рамонту тэхнікі. Гэта дазваляе папярэдзіць паломкі дарагіх машын — кошт 450-тоннага самазвала даходзіць да мільёна долараў.

— Мы як навукоўцы сёння працуем на 2032—2035 гады. Што датычыцца беспілотнага транспарту, у нас ёсць тэхнічныя напрацоўкі, мы пачалі развіваць інфраструктуру нашага палігона выпрабаванняў беспілотнага транспарту, — расказаў **намеснік дырэктара Аб'яднанага інстытута машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алег ЯЛАВОЙ,** прагназуючы што ў 30-я гады мы перасядзем на беспілотны транспарт. — Мы нікуды не падзенемся ад сусветных трэндаў і аналізуем, куды ідзе свет у розных галінах: ад медыцыны да машынабудавання, ад энергетыкі да космасу. Тым больш што тэхнічнае, тэхналагічнае і матэрыяльнае аснашчэнне айчынных прадпрыемстваў не стаяць на месцы. Найбліжэйшыя 5—7 гадоў, максімум дзесяць нашу машынабудаўнічую сферу моцна зменяць.

Навукоўцы інстытута машынабудавання працуюць з усімі айчыннымі флагманамі машынабудавання — БелАЗам, МАЗам, МТЗ, Гомсельмашам, Белкамунмашам. Выкарыстоўваюцца іх распрацоўкі і ў самых нечаканых сферах, напрыклад, у медыцыне.

— Тыя ж пакрыцці, нанесеныя на пэўныя аб'екты, механізмы, сасуды могуць як прыцягваць на сябе пэўныя мікраарганізмы, так і пазбаўляць ад іх. Напрыклад, абеззаражваць паверхні. І такія праекты ў медыцыне ў нас ужо ёсць, — адзначыў Алег Ялавой.

Унікальныя разлікі, якіх нідзе ў свеце пакуль няма, зрабілі навукоўцы для зуба-сківічнага апарату: як паводзіць сябе зуб у напружана-дэфармаваным стане сківіцы.

**Тым часам**

## Сітуацыя на глабальным аўтамабільным рынку далёкая ад аптымізму

**Еўрасаюз.** Аўтамабільная прамысловасць займае важнае месца ў эканоміцы ЕС, яе аб'ём складае 7 % ад агульнага ВУП. У Германіі працуюць 42 аўтазаводы, у Францыі — 31, у Італіі — 23, у Іспаніі — 17. У еўрапейскай аўтапрамысловасці працуюць каля 12,7 млн чалавек, гэта каля 6,6 % ад усёй занятасці ў Еўрасаюзе. У 2024 годзе спад у галіне склаў 6,5 % у параўнанні з 2023 годам. Па даных Еўрапейскай федэрацыі вытворцаў жалеза і сталі на еўрапейскім кантыненце ў 2025 годзе чакаецца нязначны аднаўленчы рост да 1,9 % у гадавым вырашэнні. Попыт застанецца слабым да таго часу, пакуль істотна не палепшыцца макраэканамічная сітуацыя і не павысяцца даходы спажыўцоў.

**ЗША.** У аўтапраме ЗША дамінуе так званая «Вялікая дэтройцкая тройка» — тры найбуйнейшыя амерыканскія аўтамабілебудаўнічыя кампаніі, якія базіруюцца ў горадзе Дэтройт альбо ў непасрэднай блізкасці ад яго, — General Motors, Ford Motor Company і Stellantis. У цяперашні час ЗША займаюць другое месца сярод найбуйнейшых вытворцаў аўтамабіляў у свеце. Штогод амерыканскія вытворцы выпускаюць 8-10 млн аўтамабіляў.

У галіне непасрэдна занята больш за 1,7 млн чалавек, якія ствараюць 2/5 ад усёй прамысловай прадукцыі (па кошце). Паводле даных Нацыянальнай асацыяцыі амерыканскіх аўтадылераў, на канец 2024 года продаж новых легкавых аўто склаў 15,7 млн. Гэта амаль на 2 млн менш, чым было прададзена ў рэкордны 2016-ы, і на 5,3 млн больш, чым у правальны 2009-ы. Выручка на рынку легкавых аўтамабіляў у 2024 годзе дасягне 842,9 млрд долараў ЗША.

**КНР.** Кітайскі аўтарынак займае лідарскія пазіцыі ў свеце, забяспечваючы прыблізна 30 % глабальных продажаў аўтамабіляў і больш за 75 % сусветнага аб'ёму рэалізацыі электрамабіляў. У краіне налічваецца больш за 80 аўтамабільных кампаній. Але дамінантную ролю займаюць ТОП-10 найбуйнейшых аўтавытворцаў (SAIC, FAW, BYD, Changan, GAC, Dongfeng, BAIC, Chery, Geely і Great Wall). З адкрытых крыніц вынікае, што прыкладна на 10 % ВУП Кітая забяспечваецца менавіта аўтамабільнай прамысловасцю — гэта каля 1,77 трлн долараў. Па ацэнцы Кітайскай асацыяцыі аўтавытворцаў вытворчасць аўтамабіляў у Кітаі па выніках 2024 года павялічылася на 3,7 % — да 31,282 млн. Экспартавана 5,859 млн машын, што на 19,3 % больш, чым годам раней. З іх 4,955 млн склалі легкавушкі (плюс 19,7 %), а 904 тыс. прыпала на камерцыйны транспарт (плюс 17,5 %). У 2025 годзе чакаецца, што продажы аўтамабіляў у КНР дасягнуць 32,9 млн (павышэнне на 4,7 %), з якіх 16 млн будуць складаць аўтамабілі на новых крыніцах энергіі (NEV) (рост на 24,4 %).

**Георгій ГРЫЦ.**

Яна адзначыла, што, хаця большасць аддае перавагу аўтаматычнай каробцы перадач, нямала і тых, хто верны праверанай часам «механіцы» — і сярод аўтамабіляў BELGEE знойдуць мадэль па сэрцы і першыя, і другія. У дылерскіх цэнтрах BELGEE «самым народным», найбольш запатрабаваным пакупнікамі, называюць красовер BELGEE X50.

Што датычыцца першага беларускага электрамабіля BelGee EX50, то яго серыйная вытворчасць пакуль не распачата, сабраны толькі доследныя ўзоры. Мадэль чакаюць этапы тэхнічных выпрабаванняў і камерцыялізацыі, распавяла Наталля Харкова. Спецыяліст адзначыла, што па якасці электрамабіль (красовер на базе Geely Coolray) будзе канкурэнтаздольны ў адносінах да тых, якія ездзяць сёння па дарогах Беларусі — а электрамабілі хутка набіраюць папулярнасць у нашай краіне. Важна дамагчыся, каб BelGee EX50 быў таксама канкурэнтны па цане.

Нагадаем, што стаўкі па крэдытах на машыны BELGEE складалі ў мінулым годзе па зноў выдадзеных крэдытах ад 7,15 да 7,88 % (у залежнасці ад банка) у першыя тры гады, а пазней — з павышэннем да стаўкі рэфінансавання (9,5 %) плюс 3 %. А максімальны тэрмін крэдыту складаў 10 гадоў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# РОБАТ ЗАМЕСТ ШВАЧКІ,

— Набіраем вопыт, выпрацоўваем імплантанты рознага кшталту: каленных суставаў, клапанаў сэрца, якія робіць «Планар». Сфера прымянення навукі ў прамысловасці проста вялізная, — рэзюмаваў Алег Ялавой.

## ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ

Адным з флагманаў айчыннай мікраэлектронікі з'яўляецца ААТ «Інтэграл», высокая якасць прадукцыі якога адзначана прэміяй урада ў галіне якасці, а зусім нядаўна кіраўнік дзяржавы ўзнагародзіў прадпрыемства Знакам якасці. І калі 1990-я гады для айчыннага прадпрыемства былі не лепшым часам — тады былі страчаны пэўныя тэхналогіі, то цяпер — час магчымасцяў.

— Менавіта цяпер у нас ёсць шанц. Мы кантактуем з вельмі добрымі партнёрамі з Кітая, дзе сканцэнтравана вялікая колькасць прамысловых прадпрыемстваў, шмат інавацыйных рашэнняў, якія яны ўкаранілі. Мы можам зрабіць вялікі скачок у развіцці і ўкараненні інавацый. Санкцыі нам у гэтым, як ні дзіўна, дапамагаюць, — адзначае **намеснік генеральнага дырэктара па якасці ААТ «Інтэграл»— кіруючая кампанія холдынга «Інтэграл» Аляксей ЦЫВАКА.**



На прадпрыемстве шырока ўкараняюць аўтаматызацыю вытворчасці і робататэхніку. Што датычыцца кантролю якасці прадукцыі, працуюць на «Інтэграле» над укараненнем інтэлектуальнай адбракоўкі вырабаў, якая цалкам заменіць чалавека.

## ШЫЮЦЬ РОБАТЫ

А вось прадпрыемствы лёгкай прамысловасці ўкараняюць інавацыйную сыравіну. У прыватнасці, Брэсцкі панчошны камбінат вырабляе мужчынскія, жаночыя і дзіцячыя шкарпэткі з бамбукавага валакна. Часткова гэта звязана таксама з санкцыямі — менавіта яны закранулі пастаўкі сыравіны айчынным вытворцам.

Летась больш шырока стала выкарыстоўвацца ў вытворчым цыкле робататэхніка. Напрыклад, Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне ў 2024 годзе ўстанавіла першую ў краіне аўтаматызаваную лінію па пашыве пасцельнай бялізны, а абутковая фабрыка «Белвест» укараніла рабатызаваныя комплексы, якія выконваюць раскрой скур. Як адзначыла **выконваючы абавязкі дырэктара Цэнтра навуковых даследаванняў лёгкай прамысловасці Ірына ШВАЙКОВА,** у перспектыве аналагічным абсталяваннем абзавядуцца і іншыя прадпрыемствы галіны, каб паступова адыходзіць ад ручной працы.

Актыўна мадэрнізуе свае фабрыкі і Аршанскі льнокамбінат — найбуйнейшы вытворца льняных тканін і вырабаў з лёну ў краінах СНД і Еўропы, які мае экспартна-арыентаваную накіраванасць і каля 80—90 працэнтаў прадукцыі пастаўляе на экспарт. Летась тут былі ўстаноўлены два рабатызаваныя комплексы па пашыве ручнікоў.

## КАДРЫ ПАД ЗАДАЧЫ ВЫТВОРЧАСЦІ

Адным са складнікаў паспяховага развіцця прамысловасці з'яўляецца падрыхтоўка інжынерных кадраў, пра што ішла размова на нарадзе ў прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі 17 снежня мінулага года на базе БНТУ. Як расказаў **першы прарэктар БНТУ, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Андрэй САФОНАЎ,** ва ўніверсітэце працуе адукацыйны цэнтр, створаны сумесна з МАЗам, аналагічны адукацыйны цэнтр арганізоўваецца сумесна з Мінскім заводам шасцерань. Дагаворы аб стварэнні аналагічных адукацыйных пляцовак падпісаны з БелАЗам і «Пеленгам». Тут у прыватнасці будуць асвойваць кампетэнцыі стварэння беспілотнага транспарту.

— Універсальных інжынераў не бывае. Мы рыхтуем спецыялістаў пад задачы вытворчасці сумесна з прадпрыемствамі, — падкрэсліў Андрэй Сафонаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Бобруйский машиностроительный завод», Могилевская область, г. Бобруйск, ул. К. Маркса, д. 235, УНП 700067266 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов**

**Компрессорная оборотного водоснабжения**
(здание нежилое, **805,7 кв. м,** инв. №710/С-4488, составные части: ТП-210).
Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Карла Маркса, д. 235.**
***Сведения о земельном участке***: пл. 10,7174 га, предоставлен на праве долевой аренды (срок действия: по 19.12.2069) для строительства и обслуживания здания и сооружений производственного назначения. После продажи земельный участок будет разделён в долях, что для обслуживания лота составит **0,3688 га**

**Начальная цена с НДС 20% - 351 000 бел. руб.**
***Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 30 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 4% от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 04.03.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.03.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

ОАО «Светлогорский домостроительный комбинат»
уведомляет о проведении открытых электронных торгов на электронной торговой площадке по адресу: www.torgi.gov.by, по реализации следующего имущества

**Извещение о проведении открытых электронных торгов по продаже имущества**

| № лота | Описание | Начальная цена, бел. руб. | Шаг аукциона (5 %), бел. руб. | Задаток (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 85845 | 2/5 доли (1593,5 кв. м) в имущественном праве на объект недвижимости — капитальное строение с инв. № 342/С-12380 общей площадью 3966,8 кв. м, назначение — здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание (инв. 0153дск), расположенное по адресу: Гомельская область г. Светлогорск, ул. Свердлова, 9, на земельном учестке с кадастровым номером 325050100001004451 | **579 840,00** | 28 992,00 | 57 984,00 |

**Аукцион № 21148 состоится 11 февраля 2025 года с 09.00 до 16.00 на электронной торговой площадке** единой системы электронных торгов **по эл. адресу: www.torgi.gov.by**

Всю подробную информацию о лотах можно узнать на торговой площадке: **www.torgi.gov.by,** набрав в поиске интересующий лот.

Для участия в электронных торгах необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 09.00 11.02.2025.

Заявитель вправе изменить или отозвать заявку не позднее дня окончания срока подачи заявок, направив организатору электронных торгов уведомление в виде электронного документа.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Продавец: ОАО «Светлогорский домостроительный комбинат».

Организатор аукциона: ООО «Правовая Стратегия», антикризисный управляющий.

Задаток перечисляется на р/с Республиканского унитарного предприятия «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь» BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ» БИК BELBBY2X УНП 190318109, ОКПО 37533622. Адрес: г. Минск, ул. Берсона, 1А, ком. 513. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № личного кабинета).

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 (пяти) дней со дня завершения электронных торгов. Срок оплаты 30 дней.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством. Затраты на организацию и проведение электронных торгов утверждаются управляющим.

Ознакомиться с объектом (лотом) аукциона можно в дни приема документов на участие в аукционе у продавца по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, д. 10. Контакты для осмотра: +375 29 693 20 10 (Александр), по оформлению договора 8(02342) 5-85-23 (Марина).

С правилами торгов можно ознакомиться по адресу: www.torgi.gov.by

# «КАЛІ ЯНЫ ХОЧУЦЬ — НЯХАЙ ЕДУЦЬ, ЗДЫМАЮЦЬ»

## Замежныя журналісты азнаёміліся з сітуацыяй на паўднёвай граніцы Беларусі

28 студзеня ў Гомельскім раёне на пункце пропуску «Новая Гута», які не функцыянуе два гады, было незвычайна мнагалюдна. Сюды прыехалі прыкладна 60 журналістаў з дзевяці краін. Карэспандэнты, якія жадалі ўбачыць на свае вочы рэальную абстаноўку на граніцы Беларусі з Украінай і даведацца аб службе беларускіх пагранічнікаў, атрымалі ўнікальную магчымасць зрабіць гэта. Прыехалі на паўднёвую граніцу і карэспандэнты БелТА.

**Рашэнне аб арганізацыі гэтага прэс-тура было прынята пасля таго, як на прэс-канферэнцыі 26 студзеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Беларусь — адкрытая краіна і праілюстраваў свае словы прыкладам. Як далажылі Прэзідэнту, прадстаўнікі нямецкага СМІ захацелі пабываць на беларуска-ўкраінскай граніцы для здымак, але беларускія пагранічнікі забаранілі ім гэта. «Я кажу: «Вы што? Вы паклікалі журналістаў і ім забараняеце нешта рабіць у Беларусі? Яны ж тэракты не здзяйсняюць?» — «Не». — «Дык чаго вы ім забараняеце? Неадкладна патэлефануйце. Калі яны хочуць — няхай едуць, здымаюць. Але папярэдзьце, што да граніцы пажадана не набліжацца», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.**

«Вельмі цікава. Я хацела тут пабываць. Яшчэ калі мы ехалі сюды на выбары, нам сказалі, што можа быць магчымасць з'ездзіць да граніцы. Не чакалі, што ўбачым саму граніцу. Да таго ж усё арганізавалі вельмі хутка», — падзялілася ўражаннямі карэспандэнт газеты «Известия» Лізавета Барысенка.

**Афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Антон БЫЧКОЎСКІ** правёў кароткі інструктаж для журналістаў і расказаў праграму мерапрыемства. Ён падкрэсліў, што работнікі СМІ могуць свабодна працаваць на прадстаўленых лакацыях, задаваць любыя ўдакладняльныя пытанні.

Спачатку журналістам з Вялікабрытаніі, Даніі, Кітая, Польшчы, Расіі, ЗША, Турцыі, Фінляндыі і Францыі паказалі кантрольны пункт побач з уездам у пагранічную зону. Тут карэспандэнты ўбачылі, як праходзіць нагляд машын і праверка дакументаў грамадзян. Пасля пачатковага брыфінгу прэса адправілася на сам пераход.

Па рашэнні кіраўніцтва Украіны з 28 лютага 2022 года ўсе міжнародныя пункты пропуску, пункты спрошчанага пропуску на граніцы Украіны з Беларуссю былі закрыты. На гэты момант міжнародныя зносіны не ажыццяўляюцца. Пры гэтым, падкрэсліў Антон Бычкоўскі, з беларускага боку пункты пропуску на граніцы з Украінай функцыянуюць, а пагранічнікі гатовы ў самыя кароткія тэрміны цалкам аднавіць міжнародныя зносіны з сумежным бокам. Калі пункт пропуску працаваў, сярэднясутачны пасажырапаток у ім зімой даходзіў да пяці тысяч чалавек і дзвюх тысяч машын, а летам — да 17 тысяч асоб і да васьмі тысяч машын. У абодва бакі ішлі фуры з таварамі, а летам беларусы ездзілі на адпачынак да Чорнага мора.

Прыбыўшы ў пункт пропуску «Новая Гута», які не функцыянуе цяпер, журналісты адразу пачалі пытацца ў пагранічнікаў, якія знаходзяцца на службе, аб іх рабоце, іх узбраенні і рыштунку. «Нашы ваеннаслужачыя ўзброены аўтаматамі Калашнікава, у кожнага ёсць шлем, бронекамізэлька і аптэчка. Працуюць тут і службовыя сабакі, якія шукаюць выбуховыя рэчывы. Акрамя таго, пагранічныя нарады экіпіруюцца відэарэгістратарамі», — расказаў начальнік аддзялення пагранічнага кантролю.









Фота БелТА.

Пасля гэтага Антон Бычкоўскі адказаў на ўсе пытанні, якія цікавілі журналістаў. Работнікі СМІ задавалі шмат удакладняльных пытанняў. У асноўным размова ішла пра абстаноўку на граніцы. «Цяпер абстаноўка (на граніцы з Украінай. — **Заўв. БелТА**) кантралюецца. Органы пагранічнай службы выконваюць задачы ва ўзмоцненым варыянце нясення службы, не страчваючы пільнасці, нягледзячы на тое што апошнім часам мы можам канстатаваць: сітуацыя мае тэндэнцыю да нармалізацыі», — сказаў Антон Бычкоўскі.

Паводле слоў афіцыйнага прадстаўніка пагранведамства, у прыгранічных раёнах Украіны (паблізу граніцы Беларусі) фіксуецца каля 15 тысяч ваеннаслужачых. Гэта ўкраінскія ўзброеныя сілы, нацгвардыя, паліцыя і тэрытарыяльная абарона. «Што датычыцца аховы дзяржаўнай граніцы, апошнім часам мы фіксуем, што пагранічныя нарады Украіны ў большай ступені паводзяць сябе спакойна, прафесійна», — падкрэсліў Антон Бычкоўскі.

Ён таксама расказаў, што за 2024 год на граніцы з Украінай зафіксавана каля 350 палётаў беспілотнай лятальнай авіяцыі. «Прыблізна ў 20 выпадках фіксаваліся парушэнні паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, парушэнні граніцы гэтымі беспілотнымі лятальнымі апаратамі», — дадаў Антон Бычкоўскі.

Афіцыйны прадстаўнік ДПК адзначыў, што пагранічная служба і пагранічныя нарады Беларусі прымаюць адпаведныя меры. «Пагранічныя нарады ўзброены радыёэлектроннымі стрэльбамі, помпавай зброяй, каб не дапускаць парушэння дзяржаўнай граніцы беспілотнікамі», — расказаў прадстаўнік ДПК.

Калі журналісты атрымалі адказы на ўсе пытанні, пагранічнікі правялі іх да наступнага пункта маршруту — непасрэдна да граніцы, якая знаходзіцца прыкладна за 1,5 км ад пункта пропуску. З украінскага боку дарога застаўлена фартыфікацыйнымі збудаваннямі.

Карэспандэнт фінскага тэлеканала Yle Хейкі Хейсканен адзначыў, што не скарыстацца такой унікальнай магчымасцю не мог. Ён таксама падкрэсліў, што сітуацыя, якая склалася на граніцы з-за канфлікту ва Украіне, сумная.

Наступным пунктам маршруту журналістаў стала кантрольна-следавая паласа. Тут выбудавана сістэма з агароджы, «разумных» камер і розных датчыкаў. Карэспандэнты не ўпусцілі магчымасці і тут задаць удакладняльныя пытанні. У прыватнасці, Антон Бычкоўскі расказаў, што бываюць выпадкі, калі мужчыны, якія ратуюцца ад мабілізацыі ва Украіне, спрабуюць бегчы ў Беларусь. Некаторых ловяць як парушальнікаў граніцы, а некаторыя падрываюцца на мінах на ўкраінскім баку граніцы.

У канцы праграмы пагранічнікі падрыхтавалі для гасцей прыемны сюрпрыз: гарачую салдацкую кашу, чай і іншую ежу ў якасці абеду. Таксама кожнаму журналісту ўручылі падарунак на памяць пра наведванне беларускай граніцы.

**Беларускім журналістам было вельмі цікава даведацца аб уражаннях іншых замежных журналістаў ад арганізаванага для іх мерапрыемства. Аднак работнікі Washington Post, France Press, тэлеканалаў Polsat, AFP і радыё RFI адмовіліся ад каментарыяў, спасылаючыся на палітыку рэдакцыі.**

# КРАЙ ПЕРШАБЫТНАГА ЛЕСУ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1–й стар.)

***— Запаведнік у першую чаргу быў створаны для захавання і вывучэння каштоўных прыродных комплексаў і аб'ектаў у натуральным стане, прадухілення іх змен у выніку чалавечай дзейнасці. Гэта магчымасць у натуральных умовах прасачыць, якія пароды дрэў уступаюць першымі ў барацьбу за адкрытую прастору, як паводзяць сябе розныя прадстаўнікі фаўны і іншае. Каб прааналізаваць такі вялікі аб'ём даных, патрэбна моцная навуковая база...***

— У нашай прыродаахоўнай установе сур'ёзны навуковы кадравы патэнцыял. Супрацоўнікі пастаянна праводзяць розныя маніторынгі і назіранні, рыхтуюць практыкаарыентаваныя навукова-даследчыя работы, вынікі якіх уяўляюць вялікую цікавасць для Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і іншых навуковых арганізацый, у тым ліку замежных.

**Бярэзінскі біясферны запаведнік займае больш за 86 тыс. га і размяшчаецца на тэрыторыі Барысаўскага, Лепельскага і Докшыцкага раёнаў. Жывёльны свет прадстаўлены: 58 відамі млекакормячых; 245 — птушак; 34 — рыб, каля 17 — амфібій і рэптылій. Расце звыш 2 тыс. відаў раслін, у тым ліку 107 чырванакніжных.**

Напрыклад, адно з найбольш актуальных даследаванняў накіравана на ўдасканальванне методык ідэнтыфікацыі бурага мядзведзя, папуляцыя якога на запаведнай тэрыторыі лічыцца найбольшай у краіне. Надзённай з'яўляецца і работа па вывучэнні ўзаемадзеяння энтамафагаў (насякомаедных арганізмаў) і шкоднікаў лесу, у першую чаргу вяршынных караедаў. Іх амаль немагчыма бяспечна для навакольнага асяроддзя вытруціць хіміяй, таму біялагічныя метады знішчэння больш прымальныя.

Нашы навуковыя супрацоўнікі ўдзельнічаюць у айчынных і міжнародных форумах, канферэнцыях і іншых мерапрыемствах. Уваходзяць у склад міжведамасных каардынацыйных саветаў і рабочых груп. Назапашаны навуковы і практычны вопыт дазваляе абменьвацца найбольш эфектыўнымі практыкамі і каардынаваць работу калег з іншых прыродаахоўных устаноў.

Апрача таго, частка навуковых праграм і работ прадугледжвае міжнародны ўдзел. Наладжаны кантакты з нацыянальным паркам «Смаленскае Паазер'е», Цэнтральна-Лясным дзяржаўным запаведнікам (Цвярская вобласць), Варонежскім дзяржаўным прыродным біясферным запаведнікам імя В. М. Пяскова і іншымі. Адбываецца актыўны абмен вопытам не толькі ў сферы навукі, але і турызму, экаасветы.

***— Як атрымліваецца спалучаць захаванне тэрыторыі ў некранутым стане і турыстычную дзейнасць?***

— У нас даволі жорсткія ўмовы знаходжання на ААПТ: вандраваць па ёй можна толькі па пэўных маршрутах і толькі ў суправаджэнні нашага супрацоўніка. Але такія абмежаванні нават павялічваюць цікавасць гасцей, бо іх чакае гарантавана дзікая прырода. У астатнім падыходзім з улікам узросту, фізічнай падрыхтоўкі, сямейнага статусу наведвальнікаў. Распрацаваны пешыя, веласіпедныя, конныя, лыжныя і іншыя маршруты.



















Фота Дзяніса ІЎКОВІЧА.

**На сайце запаведніка можна падабраць турпраграму па сезоне: навучыцца чытаць сляды на снезе ўзімку, атрымаць асалоду ад назірання за цецерукоўымі на такавішчы ўвесну, паслухаць знакамітыя салаўіныя канцэрты ўлетку і іншае.**

Адзін з самых папулярных відаў турызму — міфалагічны. Ён накіраваны на знаёмства з містычнымі ўяўленнямі нашых продкаў аб навакольным свеце: лесе, багне, жывёлах і гэтак далей. На славянскіх паданнях, казках і звычаях створаны традыцыйны міфалагічны фестываль «Шлях Цмока» і адносна новы восеньскі тур «Велесава ноч». Праграма апошняга складаецца з экскурсіі ў Музей міфаў, розных тэматычных квэстаў. Разынка тура прыпадае на вечар, калі госці наведваюць Сцежку міфаў, а потым каля вогнішчаў, у казачна-рамантычнай лакацыі, слухаюць легенды і чароўныя казкі.

У мерапрыемствах, асабліва падзейнага турызму, удзельнічаюць не толькі навуковыя супрацоўнікі і экскурсаводы, але і іншыя работнікі. Яны пераўвасабляюцца ў розныя міфічныя істоты (Балотніка, Вадзяніка, Кашчэя і інш.) і працуюць з турыстамі на інсталяцыях і гульнявых пляцоўках.

Ладзяцца спартыўныя і карпатыўныя сустрэчы, развіваецца дзелавы турызм. Напрыклад, для патрэб розных арганізацый здаюцца памяшканні і абсталяванне ў гасцінічных комплексах «Плаўна», «Сергуч», праводзяцца экскурсіі па Музеі прыроды і Лясным заапарку. Усюды прадугледжана суправаджэнне, каб госці атрымалі максімальна пазітыўныя ўражанні ад маршрутаў і экспазіцыі, а таксама ўзбагацілі кругагляд.

***— Дарэчы, экаасвета — яшчэ адзін прыярытэтны кірунак дзейнасці запаведніка.***

— Так, наша задача — расказаць турыстам аб міжнароднай важнасці ААПТ, яе ўкладзе ў сусветную ахову дзікай прыроды, а таксама спрыяць фарміраванню беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя, любові да роднага краю.

Экаасвета праводзіцца ў двух кірунках. Па-першае, усе маршруты і туры пракладзены так, каб госці маглі пазнаёміцца з найцікавейшымі гістарычнымі аб'ектамі і помнікамі прыроды, сустрэць характэрных прадстаўнікоў жывёльнага і раслiннага свету. Па-другое, у нас адкрыты Дом экаасветы, праводзяцца заняткі «Зялёных школ». Дзеці на спецыяльна распрацаваных экасцежках правяраюць веды, атрыманыя ва ўстановах адукацыі.

Прывозяць навучэнцаў на семінары і практыкумы і многія ВНУ. Нярэдка пасля такіх заняткаў на прыродзе маладыя людзі вырашаюць звязаць сваю будучыню з нашай установай. І гэта не можа не радаваць, бо людзі, якія працуюць на запаведнай тэрыторыі, ствараюць гісторыю і аўру гэтага непаўторнага кутка нашай Радзімы. Кожны імкнецца выканаць сваю работу максімальна добра і якасна.

Александрына ПАРШЫНА.

ДОБРАЯ НАВІНА

# ВЯРТАЮЧЫ ТРАДЫЦЫІ АЙЧЫННАГА ЗОЛАТА

## У Копысі Аршанскага раёна адрадзілі хлебапякарню

**Мясцовы хлеб у гарпасёлку выпякалі да 2018 года, пасля вытворчасць была прыпынена. Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі пякарню аднавілі ў кароткі тэрмін, урачыстае адкрыццё значнага аб'екта адбылося напярэдадні выбараў.**

Памяшканне былой пякарні перадалі ТАА «Мілккап Старт», якое, як расказаў яго дырэктар Сяргей Сарагавец, за свае сродкі правяло рамонт і закупіла новае абсталяванне, выдаткаваўшы на гэта каля 500 тысяч рублёў. Дарэчы, менавіта гэта арганізацыя адрадзіла ў Копысі і вытворчасць сыроў.

Апроч іншага, хлебапякарня стварыла новыя працоўныя месцы. Пераважная частка калектыву — жыхары гарпасёлка, некаторыя працавалі і ў старой пякарні. Цяпер майстры хлебнай справы адраджаюць тут рэцэпты савецкай класікі і беларускія народныя традыцыі. Мясцовым пакупнікам і жыхарам найбліжэйшых населеных пунктаў у «Сваёй пякарні» прапануюць хлябы «Александрыйскі», «Вясковы з кменам», «Цёмны заварны», батон «Духмяны», пірог «Макавы», розныя смачныя булачкі і шэраг іншых найменняў.



Фота БелТА.

«Магчыма, у маштабах краіны гэта не вельмі вялікі аб'ект, але для Копысі і для ўсёй Аршаншчыны ён знакавы. Дзякуючы неабыякавым грамадзянам — тым, хто ініцыяваў і прасіў, каб пякарня адрадзілася, тым, хто рэканструяваў яе, нягледзячы на розныя цяжкасці, — удалося аднавіць гэты аб'ект, дзе выкарыстоўваюць унікальныя рэцэпты хлебапячэння. Усіх са святам, усім смачнага хлеба, і хай ён будзе заўсёды ў вас і ў нас на стале!» — сказаў на цырымоніі ўрачыстага адкрыцця **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

Таксама на адкрыцці пякарні мясцоваму храму ў дар ад Прэзідэнта перадалі абраз. А пасля ў новы для гарпасёлка гандлёвы аб'ект выбудавалася вялікая чарга ахвотных адчуць смак дзяцінства. Галоўнае, пагаджаліся жыхары Копысі, што ў нас ёсць хлеб. А будзе хлеб — будзе і да хлеба.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ДАДАТКОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ І ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ З МЯСЦОВАЙ УЛАДАЙ

## «Адзін раён — адзін праект» на прыкладзе Лідчыны

**З 2022 года ў краіне рэалізуецца ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект». Раёны актыўна ўключыліся ў гэтую работу: выраблялецца запатрабаваная прадукцыя, ствараюцца новыя працоўныя месцы, укладзеныя інвестыцыі прыносяць аддачу, што найперш адбіваецца на развіцці гарадоў і малых населеных пунктаў. І Лідчына — не выключэнне.**

У рамках дзяржаўнай праграмы ў Лідскім раёне створана прадпрыемства па вырошчванні і перапрацоўцы прадукцыі з мяса індычкі ЗАТ «Белсалттрэйд». Вытворчасць для раёна не новая, але з нядаўняга часу — высокатэхналагічная і перспектыўная.

### БЕЗАДХОДНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ

Новае дыханне прадпрыемству, якое некалькі гадоў знаходзілася ў крытычным стане, даў беларускі інвестар. Літоўскі бізнесмен нядобрасумленна сышоў з рынку, пакінуўшы птушку без корму, а супрацоўнікаў прадпрыемства — без заробку. Выправіць сітуацыю спрабаваў сірыйскі бізнесмен, аднак беспаспяхова. Становішча выратаваў беларускі інвестар, набыўшы прадпрыемства ў лістападзе 2022 года.

— З першага дня давялося працаваць закасаўшы рукавы, — расказвае **генеральны дырэктар ЗАТ «Белсалттрэйд» Пётр КРАЎЧАНКА.** — Ажыццяўлялася закупка абсталявання, мадэрнізаваліся фермы па вырошчванні птушкі. Першых сутачных куранят атрымалі ў снежні 2022 года, а ў красавіку 2023 года ўвялі ў эксплуатацыю комплекс па перапрацоўцы прадукцыі з мяса індычкі.

Індычку вырошчваюць на 15 фермах, размешчаных у Лідскім раёне. У вёсцы Даржы функцыянуе завод па перапрацоўцы адходаў жывёльнага паходжання. На прадпрыемстве працуе сучасны комплекс па ачыстцы сцёкаў. Інвестыцыі — больш сямі мільёнаў рублёў. Аднак калі справа датычыцца экалогіі, тут, па меркаванні генеральнага дырэктара, варта ўкласціся. Тым больш што за папярэдніх уласнікаў — літоўцаў, якія нанеслі экалагічную шкоду, — давялося плаціць штраф.



Магутнасці прадпрыемства павялічваюцца, а гэта прадугледжвае пашырэнне аб'ёмаў вытворчасці. Вырашаецца пытанне па передачы прадпрыемству зямлі, на якой плануецца пабудаваць новы комплекс па вырошчванні птушкі, што прадугледжвае каля 100 новых працоўных месцаў, павелічэнне аб'ёмаў прадукцыі ўдвая. Усё гэта таксама ў рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект».

### ГОДНЫ ЗАРОБАК І САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА

На прадпрыемстве працуюць 350 чалавек. І гэта не толькі лідчане. У вытворчасці задзейнічаны жыхары Бярозаўкі, Астраўца, Слоніма, Гродна, Мінска. Тым, хто жыве далей, даецца жыллё, супрацоўнікаў з найбліжэйшых населеных пунктаў падвозіць аўтобус. Больш за тое, у хуткім часе праз эпіцэнтр прадпрыемства, дзе сканцэнтравана перапрацоўка, будзе праходзіць гарадскі аўтобус. Кіраўніцтва горада забяспечыла маршрут, прадпрыемства за свой кошт устанавіла прыпыначны пункт, асфальтавае пакрыццё.

«Дзякуй, што нам пайшлі насустрач, убачылі, што сюды неабходны дадатковы рэйс, — адзначае Пётр Краўчанка. — Гэта будзе добра і для тутэйшых жыхароў, якія ў нас не працуюць. Узаемадзеянне з мясцовай уладай увогуле на высокім узроўні: яны чуюць нас, мы чуем іх. І так было заўсёды. Калі нам патрэбна дапамога, яе аказваюць. У прыватнасці, індычка ўваходзіць у рацыён лідскіх школьнікаў».

Сярод супрацоўнікаў прадпрыемства пераважае моладзь — каля 60 %. Маладыя спецыялісты ахвотна ідуць сюды на работу. Сярэдні заробак — 2068 рублёў. Усе перапрацоўкі дадаткова аплачваюцца. Супрацоўнікі прадпрыемства набываюць уласную прадукцыю без гандлёвай нацэнкі.

Пачынаючы з 2022 года ў праект інвеставана звыш 15 мільёнаў рублёў. І гэта лічба будзе толькі павялічвацца. У планах — пабудаваць свой завод па вытворчасці камбікармоў. Цяпер жа сыравіна, якая закупляецца прадпрыемствам, паступае на Лідскі камбінат хлебапрадуктаў. Такім чынам, дзяржаўна-прыватнае партнёрства дае свой плён, а эфектыўнасць дзяржаўнай праграмы «Адзін раён — адзін праект» адчувальная.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота дадзена прадпрыемствам.**


## Извещение о проведении открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33 помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by** |
| **Продавец** | ООО «ААА Солюшенс», УНП: 19297125, г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, ком. 38 |

**Предмет электронных торгов**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| **1042** | Дебиторская задолженность ООО «ААА Солюшенс» (с полным списком дебиторов, можно ознакомиться на торговой площадке www.torgi24.by) | **33 521 188,99** |

**Адрес:** г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, ком. 38

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр. Победителей 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи:**
**5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов (участников)

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту – не **более 950,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов**: **17.02.2025** в 11.00. **Дата и время окончания торгов: 17.02.2025** в 16.00

